РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛЮТАГА 2025 г. ПЯТНІЦА № 36 (30424)

«СІЛА АРМІІ — ГЭТА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ МУЖНАСЦЬ, СТОЙКАСЦЬ І ПАТРЫЯТЫЗМ САЛДАТ І АФІЦЭРАЎ»

Узнагароды знайшлі сваіх герояў

Традыцыі суверэннай Беларусі ўнікальныя і моцныя, патрабуюць увагі і павагі. Адна з іх — уручэнне ў Палацы Незалежнасці дзяржаўных узнагарод і генеральскіх пагонаў прадстаўнікам вышэйшага афіцэрскага саставу напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Фота БелТА.

Як заўважыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, гэта цырымонія — асаблівая традыцыя. Яна звязана са святам, якое шануе беларускі народ.

СТАР. 2

ДРАЙВЕРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ 6

ЯКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ Ў СУСЕДЗЯЎ? 10

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

ВЫВУЧАЦЬ, ШАНАВАЦЬ, КАРЫСТАЦЦА

Як захаваць адзін з самых важных складнікаў культурнага кода нацыі?

Стала ўжо добрай традыцыяй напярэдадні Дня роднай мовы абмяркоўваць у рэдакцыі «Звязды» з удзелам дасведчаных экспертаў актуальныя пытанні, якія тычацца развіцця і існавання беларускай мовы. Гэтым разам мы сабраліся за круглым сталом, каб паразважаць, што можа дапамагчы шырэйшаму ўжыванню беларускай мовы ў нашым жыцці. Тэма на першы погляд вельмі агульная, але ў ходзе гутаркі мы выйшлі на пэўныя праблемы, канкрэтныя прыклады і цікавыя высновы.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

«СІЛА АРМІІ — ГЭТА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ МУЖНАСЦЬ, СТОЙКАСЦЬ І ПАТРЫЯТЫЗМ САЛДАТ І АФІЦЭРАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь ужо не першы год ушаноўваюць ваеннаслужачых, удастоеных дзяржаўных узнагарод. Традыцыйна гэтымі днямі прыбыло і ў палку генералаў. Як падкрэсліў беларускі лідар, вышэйшых афіцэраў, якія прысвяцілі воінскай службе большую частку свайго жыцця.

«Сёння ў беларускай арміі служаць людзі, якія свята шануюць і берагуць традыцыі пакалення пераможцаў. Унукі і праўнукі тых, хто 80 гадоў таму абараніў свабоду нашай Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны і прынёс народу Вялікую Перамогу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Быў час, калі многія думалі: войны назаўжды сыдуць у мінулае. Чалавецтва марыла, што XXI стагоддзе стане стагоддзем стваральнай працы, супрацоўніцтва і міру. Стагоддзем, у якім ваенныя змогуць супрацьстаяць адзін аднаму хіба што на спартакіядах дружалюбных войскаў. На жаль, рэчаіснасць аказалася больш суровай. Для асобных прадстаўнікоў моцных гэтага свету вайна — больш выгадны бізнес, чым мір. А жыцці простых людзей для іх увогуле нічога не вартыя».

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння замест пояса добрасуседства на заходніх рубяжах Беларусі нашы былыя саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі ўпарта малююць дугу нестабільнасці. «Выснова адна: нам трэба быць моцнымі, праяўляць пільнасць і ўмацоўваць абараназдольнасць дзяржавы настолькі, наколькі гэта магчыма. Што мы ўвесь час і робім. Вы як ніхто іншы разумееце, што моцных паважаюць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

> **«І таму прафесія — Радзіму абараняць — яшчэ доўга будзе актуальнай і запатрабаванай, а людзі ў пагонах — надзейным шчытом і галоўнымі захавальнікамі мірнай працы».**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, для ваеннай арганізацыі дзяржавы ў цэлым стаіць задача выйсці на новыя якасныя параметры. «Мы і ў далейшым будзем развіваць усебаковае супрацоўніцтва з нашымі саюзнікамі па АДКБ і з брацкай Расіяй. Ні ў каго не павінна быць сумненняў, што мір, стабільнасць і бяспека краіны — пад надзейнай абаронай», — сказаў беларускі лідар.

> **«Упэўнены, кожны з вас добра разумее, што сіла арміі вызначаецца не толькі «жалезам» (танкамі, гарматамі, самалётамі). Сіла арміі — гэта ў першую чаргу мужнасць, стойкасць і патрыятызм салдат і афіцэраў».**

Аб гэтым, дарэчы, сведчаць прыклады спецыяльнай ваеннай аперацыі. Воінаў, цалкам адданых прысязе, краіне і народу. І ваша задача — гадаваць і выхоўваць такіх воінаў», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да герояў дня.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў узнагароджаных афіцэраў і навaспечаных генералаў з высокай ацэнкай ратнай працы і асабістага ўнёску ў справу абароны Радзімы. Ён падзякаваў усім за службу: «Перакананы, што ў біяграфіі кожнага з вас будуць новыя поспехі і ўзнагароды. Ад усёй душы віншую ўсіх абаронцаў Айчыны са святам. Тых, хто сёння ў страі, а таксама ветэранаў, вашы сем'і, родных і блізкіх. Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, аптымізму і новых здзяйсненняў на карысць нашай Радзімы — Рэспублікі Беларусь».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

У тэму

Прызнанне заслуг і дадатковая адказнасць

Віншуючы герояў дня, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэты дзень у іх жыцці застанецца назаўсёды. Ён таксама падкрэсліў, што акрамя сем'яў за гэтых мужчын рады і ўвесь беларускі народ. А што самі героі дня думаюць аб сваіх узнагародах?

Аляксандр ПРУДНІКЕВІЧ, узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, цяпер ужо на пенсіі. Але, па яго словах, былых ваенных не бывае. Сваю службу ён пачаў у 1996 годзе ў Полацку, у 228-м асобным палку радыёэлектроннай барацьбы. І на працягу больш чым 28 гадоў праходзіў службу менавіта ў гэтым палку. Пачынаў з пасады камандзіра ўзвода, скончыў яе на пасадзе камандзіра палка. «Беларуская армія за гады маёй службы змянілася каласальна. Аб той тэхніцы, якую цяпер мае полк, мы ў пачатку маёй службы маглі толькі марыць», — адзначыў Аляксандр Пруднікевіч. Ён прызнаўся, што высокай узнагародай ганарыцца, але для людзей у пагонах гэта не самае галоўнае. «Галоўнае — гэта абавязак, Айчына, абарона людзей, якія жывуць у нашай краіне, клопат аб сваёй сям'і, родных, блізкіх. І я ганаруся, што служыў у арміі. Сам добраахвотна пайшоў служыць і ні аб чым не шкадую. Мой дзед у гады вайны ваяваў у партызанах, бацька быў ваенным. І я вельмі ганаруся, што працягнуў нашу дынастыю», — падзяліўся Аляксандр Пруднікевіч.

Начальнік Брэсцкай мытні Сяргей ЯКУТА атрымаў персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу. «Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. І прысваенне дзяржаўнага звання саветніка мытнай службы III рангу — гэта высокая ўзнагарода. І не толькі для мяне, але і для ўсяго даручанага мне калектыву. З аднаго боку, ты разумееш, што гэта заслуга тваёй шматгадовай карпатлівай працы. Але ў той самы час гэта і дадатковая вялікая адказнасць, якая на табе ляжыць у далейшай службе па абароне эканамічнай бяспекі і эканамічнага суверэнітэту краіны», — падзяліўся ён.

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

КАНСТРУКТЫЎНЫЯ АДНОСІНЫ РАЗВІВАЮЦЦА

Падчас візіту парламенцкай дэлегацыі ў Баку
Наталля Качанава сустрэлася з кіраўніцтвам Азербайджана

Пасля пленарнага пасяджэння Азіяцкай парламенцкай асамблеі, удзел у якой прымала і дэлегацыя Нацыянальнага сходу Беларусі на чале з Наталляй КАЧАНАВАЙ, Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з Прэзідэнтам Азербайджанскай Рэспублікі Ільхамам АЛІЕВЫМ.

Наталля Качанава перадала Ільхаму Аліеву добрыя пажаданні і прывітанні ад яго беларускага калегі Аляксандра Лукашэнкі.

У ходзе размовы гаварылася аб развіцці сувязяў паміж краінамі ў розных галінах. З задавальненнем быў адзначаны леташні дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Азербайджан, падкрэслена яго роля ў развіцці двухбаковых адносін.

Наталля Качанава адзначыла: «Для мяне вельмі вялікі гонар сёння пазнаёміцца з Вамі асабіста. Я хацела б падзякаваць нашым калегам за запрашэнне прыняць удзел у такой высокай парламенцкай асамблеі. Я ўпершыню ў вашай цудоўнай краіне».

На сустрэчы адзначана паспяховае развіццё сувязяў паміж парламентамі дзвюх краін, закрануты значэнне правядзення ў Баку 15-й пленарнай сесіі Азіяцкай парламенцкай асамблеі.

Як падкрэсліў Ільхам Аліеў, прыемна, што дружалюбная Беларусь прадстаўлена на такім высокім узроўні і ў беларускіх парламентарыяў у час візіту была магчымасць паразмаўляць з калегамі. «Трэба часцей сустракацца».

Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам АЛІЕВЫМ.

Таксама адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з прэм'ер-міністрам Азербайджанскай Рэспублікі Алі Асадавым.

У ходзе сустрэчы было выказана задавальненне высокім узроўнем азербайджана-беларускіх міждзяржаўных сувязяў, адзначана дынамічнае развіццё ўзаемавыгаднага партнёрства ў розных сферах дзякуючы цесным кантактам і сумесным намаганням прэзідэнтаў дзвюх краін.

Бакі акцэнтавалі ўвагу на міжпарламенцкім супрацоўніцтве, выказаўшы задавальненне ўзроўнем канструктыўнага дыялогу паміж заканадаўчымі органамі Азербайджана і Беларусі як у двухбаковым, так і шматбаковым фармаце.

Была адзначана важнасць правядзення ў Баку 15-й пленарнай сесіі Азіяцкай парламенцкай асамблеі і выказана задавальненне атрыманнем Парламентам Беларусі статусу наглядальніка ў арганізацыі.

Таксама былі абмеркаваны перспектывы далейшага нарошчвання азербайджана-беларускага ўзаемавыгаднага партнёрства ў сферах, якія маюць узаемную цікавасць.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

На сустрэчы з прэм'ер-міністрам краіны Алі АСАДАВЫМ.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

ІНВЕСТЫЦЫІ — РУХАВІК РАЗВІЦЦЯ РЭГІЁНАЎ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка з рабочым візітам наведаў Віцебск

Спікер узяў удзел у пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама, прысвечаным інвестыцыйнай дзейнасці ў раёнах вобласці. Ігар СЕРГЯЕНКА выказаў думку, што стрымлівае інвестыцыйную дзейнасць Віцебскай вобласці, калі меркаваць па мінулым годзе, перш за ўсё неасваенне сродкаў па розных кірунках.

«Наступная пазіцыя — структура інвестыцый. У большай ступені гэта выкарыстанне ўласных сродкаў прадпрыемстваў і бюджэтных сродкаў. Сумарна гэта прыкладна 80 %, банкаўскія крэдыты — каля 15 %. І нікчэмна малая лічба прыцягнення замежных інвестыцый — менш за адзін працэнт», — адзначыў спікер і дадаў, што ў паўночным рэгіёне недастаткова актыўна выкарыстоўваюцца механізмы закона аб інвестыцыях, які ўступіў у сілу летась.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН адзначыў, што па выніках работы за 2024 год па ўсіх інтэгральных паказчыках Міністэрства эканомікі вывела Віцебшчыну на другое месца ў краіне. «У гэтай перамозе — наша агульная заслуга. Але я расцэньваю гэта як першыя значныя крокі і першыя вынікі. Напарадзе яшчэ вельмі шмат працы, і інвестыцыі на шляху развіцця — найважнейшы паказчык. Гэта ключавы маркер нашай будучыні», — сказаў кіраўнік паўночнага рэгіёна.

За 2024 год у эканоміку Віцебскай вобласці прыцягнута практычна чатыры мільярды рублёў з тэмпам росту 110,8 %. За апошнія два гады тэмп росту інвестыцый павялічаны ў 1,3 раза, а за чатыры гады бягучай пяцігодкі рэгіён атрымаў больш за 12 млрд рублёў інвестыцый. **Намеснік старшыні аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА** адзначыла важным той факт, што растуць якасныя параметры гэтых інвестыцый. «У асноўным мы ўкладваем у машыны і абсталяванне, гэта сведчыць аб якасных характарыстыках. Нашы прадпрыемствы сталі ўкладваць больш уласных сродкаў у развіццё рэгіёна і сваіх прадпрыемстваў», — падкрэсліла яна.

Фота БелТА.

У 11 раёнах завершана рэалізацыя ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект». У рамках даручэння кіраўніка дзяржавы ў паўночным рэгіёне рэалізавана 13 буйных інвестыцыйных праектаў з колькасцю працоўных больш чым 20 чалавек. На рэалізацыю праектаў дзяржаўнай і рэгіянальнай інвестыцыйных праграм у 2025 годзе будзе накіравана каля 500 млн рублёў. Таксама ў рэгіёне трэба будзе ўвесці ў эксплуатацыю 400 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў. Аб'ём інвестыцый на іх будаўніцтва складзе каля аднаго мільярда рублёў.

З мэтай выканання пастаўленых задач актуалізаваны пералік са 116 аб'ектаў нерухомасці, што знаходзяцца ва ўласнасці гарадоў і раёнаў Віцебскай вобласці, якія могуць быць прапанаваны для бязвыплатнай перадачы для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта або выстаўлены на аўкцыён за адну базавую велічыню. Абноўлены і пералік з 92 свабодных вытворчых пляцовак на тэрыторыі Віцебскай вобласці для прадастаўлення іх інвестарам пад стварэнне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў.

Анжаліка Нікіціна таксама падкрэсліла важнасць забеспячэння спрыяльных умоў для рэальнага сектара эканомікі ва ўсіх рэгіёнах вобласці. «Рэзервы для гэтага ў кожным рэгіёне дастаткова. Таму кіраўнікам усіх узроўняў неабходна ўзяць пад асабісты кантроль пошук інвестыцыйных праектаў, актыўна выкарыстоўваць дзеючыя меры дзяржаўнай і фінансавай падтрымкі, уключаць у абарот маёмасць, што не выкарыстоўваецца, ажыццяўляць маніторынг выканання графікаў работ, якія праводзяцца, забяспечваць своечасовасць разлікаў пры рэалізацыі вытворчых і інфраструктурных праектаў, будаўніцтве жылля», — заключыла намеснік старшыні аблвыканкама.

На развіццё эканомікі Віцебскай вобласці ў 2025 годзе плануецца накіраваць каля 4,7 мільярда рублёў, што дасць магчымасць забяспечыць тэмп росту 107,8 % да ўзроўню 2024 года.

Падводзячы вынікі пасяджэння, Старшыня Палаты прадстаўнікоў расставіў акцэнты, на якія варта звярнуць увагу. «Не хапае ў нейкай ступені ініцыятывы, дыскыпліны ў рэалізацыі гэтых праектаў, індывідуальнага падыходу, кантролю з боку кіраўнікоў мясцовых органаў. Вядома, магчымасці ў розных раёнаў розныя, але і патэнцыял таксама сёння ёсць, трэба толькі праявіць больш ініцыятывы. Таму на пасяджэнні ў тым ліку ішла размова аб тым, дзе можна нарасціць намаганні, стварыць дадатковыя працоўныя месцы, каб зрабіць раёны, канкрэтныя прадпрыемствы прывабнымі для людзей», — сказаў Ігар Пятровіч.

Ігар Сергяенка таксама сустрэўся са студэнтамі і педагагічным калектывам віцебскай ветэрынарнай акадэміі. Былі абмеркаваны тэмы, якімі жыве наша краіна, асаблівую ўвагу спікер удзяліў маладзёжнай палітыцы і 80-й гадавіне Вялікай Перамогі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ВА ЎРАДЗЕ

ІНТАРЭС ДА ДАЛЁКАЙ ДУГІ

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА наведае з афіцыйнымі візітамі Уганду і Катар 20—24 лютага, паведамляе БелТА

Паводле слоў прэм'ер-міністра, задача максімальна канкрэтная — трэба дасягнуць патрэбных для краіны вынікаў, рэалізаваць усе напрацоўкі, якія маюцца, знайсці новыя рашэнні для таго, каб выйсці на рэалізацыю новых сумесных праектаў.

— Уганда ўяўляе для нас сур'ёзную цікавасць, гэта адна з краін Афрыкі, якая найбольш хутка развіваецца, дружалюбная для Беларусі, маюцца кантакты. У краіне ўзяты курс на мадэрнізацыю эканомікі, прыцягненне тэхналогій, развіццё сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Уганда сутыкаецца з тыповымі праблемамі для афрыканскіх краін. Хутка расце насельніцтва, якое трэба карміць, лячыць, навучаць. Недастаткова выкарыстоўваюцца зямельныя рэсурсы краіны, патрабуецца інтэнсіўная механізацыя сельскай гаспадаркі, індустрыялізацыя эканомікі, здабыча і ачыстка водных рэсурсаў, перапрацоўка адходаў. Іншымі словамі, усё, што мы добра ўмеем рабіць, і ёсць прыклады кааперацыі з замежнымі дзяржавамі. Пэўны таварааборот з гэтай краінай маецца, але яго неабходна вывесці на якасна новы ўзровень, — сказаў Раман Галоўчанка.

Катар — краіна з іншымі патрэбамі, іншай палітыкай і эканомікай, адзначыў ён.

— Гэта ў першую чаргу наш патэнцыяльны і перспектыўны партнёр для рэалізацыі сумесных высокатэхналагічных праектаў. Катар з'яўляецца адной з буйных краін-донараў для іншых рэгіёнаў, таму цалкам можна працаваць над рэалізацыяй сумесных праектаў у трэціх краінах з выкарыстаннем беларускай тэхнікі і тэхналогій. Краіна для нас, безумоўна, дружалюбная, шматлікія візіты, поўнае паразуменне ў палітычнай сферы, — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Падчас візіту ва Уганду Раман Галоўчанка правядзе сустрэчу з Прэзідэнтам краіны Ёверы Кагута Мусевені ў фармаце адзін на адзін. Члены беларускай і ўгандыйскай афіцыйных дэлегацый правядуць перагаворы. Па выніках запланавана падпісанне міжнародных дакументаў.

У Катары намечана сустрэча кіраўніка беларускага ўрада з прэм'ер-міністрам — міністрам замежных спраў Катара шэйхам Махамедам бен Абдэльрахманам бен Джасэмам аль-Тані. Таксама запланаваны шэраг іншых сустрэч з кіраўніцтвам краіны.

Афіцыйныя візіты Рамана Галоўчанкі ва Уганду і Катар — частка пасляддоўнай работы ўрада па развіцці супрацоўніцтва з краінамі далёкай дугі. У 2024 годзе ў графіку візітаў прэм'ер-міністра былі такія краіны, як Венесуэла, Куба, Нікарагуа, Аман і Пакістан.

БЯСПЕКА

АДКРЫТАСЦЬ І ТРАНСПАРЭНТНАСЦЬ ВАЕННАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Гэта нязменная частка палітыкі беларускай дзяржавы

Беларусь робіць захады, каб знайсці кансэнсус для ўрэгулявання ўсіх вострых пытанняў каля нашых граніц. Аб гэтым падчас брыфінгу заявіў начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Валерый РАВЕНКА. На брыфінг былі запрошаны прадстаўнікі замежнага ваенна-дыпламатычнага корпуса з 24 дзяржаў свету.

Валерый Равенка заўважыў, што Беларусь па сетцы сувязі АБСЕ апавясціла нашых суседзяў аб тым, што гатовая да правядзення мерапрыемстваў у рамках рэгіянальных мер даверу і бяспекі па Венскім дакументе 2011 года: «Мы гатовыя да працэсаў наведвання воінскіх часцей, гэта значыць, інфармацыйнага абмену і правядзення ўзаемных інспекцый як на тэрыторыі Беларусі, так і тэрыторыі Рэспублікі Польшча на глыбіню 80 кіламетраў. Што гэта нам дае? Польшча можа пераканацца ў тым, што мы не назапашваем сілы і сродкі для якіх-небудзь агрэсіўных дзеянняў, можа пераканацца ў тым, што мы міралюбівыя. Мы гатовыя да дыялогу і супрацоўніцтва. Беларусь можа пераканацца, што на тэрыторыі Польшчы не назапашваюцца сілы і сродкі для правядзення агрэсіўных дзеянняў у дачыненні да Саюзнай дзяржавы. Мы ведаем пра аперацыю «Бяспечнае Падляшша», ведаем, што фарміруюцца тры дывізіі, у тым ліку на паказальнай адлегласці — 80 кіламетраў ад граніцы Беларусі. Прапанова аб узаемных інспекцыях — своеасаблівы тэст для Польшчы. Калі наш заходні сусед будзе гатовы да гэтых мерапрыемстваў, то мы, адпаведна, зразумеем, што палітыка міралюбівая і накіравана на пошук кампрамісаў і ўстанаўлення добрасуседства, добрага дыялогу. Ну а калі Рэспубліка Польшча адмовіцца або праігнаруе дадзенае мерапрыемства, то, адпаведна, у нас будзе іншае меркаванне пра іх палітыку, і мы будзем ужо будаваць сваю ў тым ліку ваенную палітыку, зыходзячы з атрыманых вынікаў».

Памочнік міністра абароны падкрэсліў, што адкрытасць і транспарэнтнасць ваеннай дзейнасці — нязменная частка палітыкі беларускай дзяржавы: «Гэта дзейнасць, нягледзячы на ўсю сваю спецыфіку, заўсёды была максімальна адкрытай. У апошнія гады яе можна ахарактарызаваць як беспрэцэдэнтна адкрытую. Столькі інтэрв'ю, у тым ліку вышэйшых службовых асоб, артыкулаў, відэасюжэтаў па ваеннай тэматыцы не было ніколі. Расце і колькасць мерапрыемстваў міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, удзел у якіх дазваляе іншым дзяржавам атрымаць комплекснае ўяўленне аб беларускай арміі».

«Узброеныя Сілы — частка беларускага народа. Мы робім усё, каб апраўдаць давер суайчыннікаў і забяспечыць мірную будучыню краіны. У тым ліку і шляхам выбудоўвання ўзаемадзеяння з іншымі дзяржавамі», — сказаў Валерый Равенка.

У размове з журналістамі ён паведаміў, што сумесныя з Расіяй вучэнні «Захад-2025» пройдуць у верасні: «Мы на сёння выпрацоўваем пазіцыю па запрашэнні дзяржаў — членаў АБСЕ на дадзеныя вучэнні. Мы прытрымліваемся Венскага дакумента 2011 года. У той жа час я не магу на гэты момант сказаць аб запрашэнні шэрагу дзяржаў, якія негатыўна ці своеасабліва ставяцца да выканання дадзенага дакумента менавіта ў дачыненні да нашай дзяржавы. Беларусь летась не запрасілі на шэраг вучэнняў, якія былі адкрытыя для назірання. Размова ідзе пра Польшчу, Эстонію, Латвію і іншыя дзяржавы. Зноў жа, мы не гаворым «не». Мы кажам, што паглядзім на далейшыя крокі, якія будуць рабіцца кіраўніцтвам гэтых дзяржаў і кіраўніцтвам абаронных ведамстваў».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота БелТА.

УРАЖАННІ

«ШТО МОЖА БЫЦЬ БОЛЬШ УРАЧЫСТЫМ ЗА НАВЕДВАННЕ ПАЛАЦА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ?»

Сувязісты атрымалі выдатны падарунак да юбілею

Пасля цырымоніі ўзнагароджання і ўручэння генеральскіх пагонаў у Палацы Незалежнасці прайшло яшчэ адно традыцыйнае мерапрыемства. Гэта традыцыя хоць і не прымеркаваная да пэўнай даты, але радасці і добрага настрою дае не менш — экскурсія ў Палац Незалежнасці. Гэтым разам ён адчыніў свае дзверы для супрацоўнікаў Міністэрства сувязі інфарматызацыі і падведамасных арганізацый. Экскурсія стала своеасаблівым падарункам — у студзені Міністэрства адзначыла 70 гадоў са дня ўтварэння.

«Міністэрству 70 гадоў — хацелася ўрачыстасці. А што можа быць больш урачыстым за наведванне Палаца Незалежнасці? У гэтых залах у людзей на вачах узнімаецца настрой і натхненне. І па іх тварах відаць, што гэта была выдатная і вельмі своечасовая ідэя», — адзначыла намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Таццяна Русакевіч.

Народная сцежка ў палац, нягледзячы на яго высокі палітычны і дзяржаўны статус, не зарастае. Ахвотных на свае вочы ўбачыць сімвал беларускага суверэнітэту ўсё больш. Таму экскурсіі сталі ўжо звыклай часткай «палацавых будняў». Але для гасцей гэта кожны раз непаўторныя ўражанні і незабыўныя эмоцыі.

Раіса Жыгалка, у мінулым начальнік аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, прызналася, што наведванне Палаца Незалежнасці для яе — сапраўдны падарунак. «Заўсёды марыла пабываць у такім прыгожым храме мастацтва, які створаны рукамі нашых беларускіх майстроў. Тут ходзіш, любуешся і нястомна захапляешся працай людзей, якія змаглі гэта стварыць. Гонар за сваіх суайчыннікаў проста зашкальвае. Гэта экскурсія назаўжды застанецца ў нашай памяці», — адзначыла яна.

Ідэя паказаць усім беларусам Палац Незалежнасці не па тэлебачанні, а ў рэальнасці належыць Прэзідэнту. Менавіта па яго распараджэнні з самага пачатку сюды арганізаваны экскурсіі. Паглядзець сапраўды ёсць на што. Люстры, мазаіка, карціны, падарункі кіраўніку дзяржавы, унікальныя дызайнерскія рашэнні, непаўторныя ўпрыгажэнні захапляюць. Узрастае захапленне і ад таго, што амаль усё тут створана беларусамі з айчынных матэрыялаў. І гэта адназначна варта ўбачыць кожнаму жыхару нашай краіны.

Лідзія Беражная расказала, што вялікай радасцю для яе стала магчымасць убачыць слуцкі пояс, выстаўлены ў зале ўрачыстых цырымоній. «Мяне цікавіць гісторыя стварэння самога палаца. Мне цікава даведацца пра гісторыю, пра падзеі, якія тут адбываюцца, пра людзей, якія наведваюць палац. У Палацы Незалежнасці цікава ўсё», — падзялілася яна.

Але Палац Незалежнасці — гэта больш, чым толькі інтэр'еры. Гэта найперш гісторыя, якая ствараецца тут кожны дзень. Па традыцыі найбольшую цікавасць выклікае гісторыя перагавораў «нармандскай чацвёркі». Знакамітая на ўвесь свет Зялёная зала адкрытая для наведвання, і кожны можа зрабіць фота на месцы, дзе вырашаліся найважнейшыя геапалітычныя пытанні. Дзе яшчэ такое магчыма?

«Зялёная зала, як і Палац Незалежнасці, уражвае атмасферай. Тут адбываліся і адбываюцца падзеі, якія ўжо ўвайшлі ў гісторыю. І вельмі прыемна быць да гэтага хоць неяк датычным. Дзякуй вялікі Прэзідэнту за магчымасць дакрануцца да гісторыі нашай дзяржавы. Упэўнены, наша краіна, чые людзі сваімі рукамі змаглі стварыць такі цудоўны палац, яшчэ шмат чаго можа дасягнуць», — падзяліўся Аляксандр Родзін, намеснік начальніка ўпраўлення Міністэрства сувязі і інфарматызацыі.

Уражанні ад такіх экскурсій застаюцца ў кожнага свае, але ёсць і агульнае — гэта не проста незабыўная падзея, а вялікая матывацыя працаваць лепш і больш якасна на карысць краіны.

Валерыя СЦЯЦКО.

АКЦЭНТЫ

Андрэй ІВАНЕЦ:

«УСЕ ЗМЕНЫ Ў СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ НАКІРАВАНЫ НА ПАВЫШЭННЕ ЯЕ ЯКАСЦІ, СПРАВЯДЛІВАСЦІ І ДАСТУПНАСЦІ»

У Мінску адбылося пашыранае пасяджэнне калегіі Міністэрства адукацыі

У рабоце калегіі прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА. На пасяджэнне, дзе абмяркоўваліся вынікі 2024 года і агучваліся задачы на год бягучы, прыбылі намеснікі старшынь аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, якія курыруюць сферу адукацыі, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў і іншыя. Да пачатку мерапрыемства госці і ўдзельнікі калегіі азнаёміліся з выставай, на якой установы адукацыі прадэманстравалі свае найлепшыя дасягненні.

— Не трэба шмат і распавядаць пра тое, чаго дасягнула галіна ў мінулым годзе, — рэзюмаваў убачанае і пачутае Ігар Петрышэнка. — Вось яны, дасягненні, і на гэтых стэндах у тым ліку.

Вяртаючыся да пытанняў, якія неабходна абмеркаваць на пасяджэнні, віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што ўсе рэформы ўжо зроблены: «Цяпер мы ажыццяўляем дакладную практычную данастройку і адаптацыю тых рашэнняў, якія прынялі». Таксама намеснік прэм'ер-міністра акрэсліў кола першачарговых задач, якія Мінадукацыі будзе вырашаць і ў гэтым годзе, і ў больш доўгатэрміновай перспектыве.

— Сёння мы падрабязна абмяркоўваем, дзе ў сістэме яшчэ ёсць рэзервы, якія дазволяць удасканальваць усе ўзроўні адукацыі. Будзем размаўляць аб дашкольнай адукацыі, гэта значыць, аб падрыхтоўцы нашых дзяцей да таго, каб яны якасна засвойвалі вучэбную праграму. Ёсць тут пэўныя тонкасці, у прыватнасці дзеці з асаблівасцямі. Мы дапамагаем і бацькам, і педагогам адаптаваць іх, каб яны маглі ў поўнай меры засвойваць вучэбную праграму. У цэнтры ўвагі таксама пытанні, звязаныя з агульнай сярэдняй адукацыяй, — гэта нашы школы. Абмяркуем усё: пачынаючы з падручнікаў, заканчваючы якасцю выкладання, а таксама залішняй колькасцю бюракратычнай дакументацыі ў школах, — сказаў ён.

Краевугольным каменем, адметнасцю беларускай адукацыі Ігар Петрышэнка назваў патрыятычнае выхаванне моладзі. — Гэта важна для таго, каб мы фарміравалі сапраўдных, паўнавартасных грамадзян, якія стануць спецыялістамі, карыснымі для сваёй краіны, — падкрэсліў ён.

2024-ы — Год якасці — для сферы адукацыі Беларусі адзначыўся шматлікімі дасягненнямі. **Міністр адукацыі Беларусі Андрэй Іванец** не стаў затрымліваць увагу ўдзельнікаў калегіі на іх пералічэнні — усе навацыі і ўдасканаленні, укаранёныя ў працэс навучання летась, паказалі не проста эфектыўнасць, а сталі сапраўдным поспехам. Яны працуюць, яны дапамагаюць падымаць якасць адукацыі на больш высокі ўзровень.

— Возьмем такі кірунак, як падтрымка адоранай моладзі. У 2024 годзе практычна ў два разы павялічылася колькасць дзяцей, якія былі залічаны ў ВНУ без уступных экзаменаў, — канстатаваў міністр адукацыі. — Нашы юныя матэматыкі занялі пятае месца на міжнароднай алімпіядзе, у якой удзельнічала 109 краін.

Расце прэстыж беларускай адукацыі і за мяжой: толькі з адным Кітаем рэалізоўваецца 30 сумесных адукацыйных праектаў, з Узбекістанам — 100. Летась дасягнуты рэкордны экспарт у адукацыі — 115 млн долараў ЗША.

Растуць і новыя школы, дамы для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот, адкрываюцца дзіцячыя садкі і іншыя аб'екты. Будаўніцтва (рэканструкцыя) 108 такіх аб'ектаў праводзілася ў мінулым годзе, у тым ліку сямі школ на 6410 вучняў і сямі дзіцячых садкоў на 1690 дашкалят.

Ніякіх кардынальных змен, па словах кіраўніка адукацыйнага ведамства, у 2025 годзе не прадбачыцца. Будуць развівацца і ўдасканальвацца такія перспектыўныя кірункі, як прафарыентацыя, прычым як у каледжах, так і ВНУ, мэтавая падрыхтоўка, работа з адоранымі і таленавітымі дзецьмі, інклюзіўная адукацыя і іншыя.

— На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі мы выконваем даручэнне Прэзідэнта, якое было дадзена на педсавеце ў 2024-м і якое датычылася стварэння навучальных класаў на базе прадпрыемстваў, — зазначыў міністр. — Ужо створана 10 такіх класаў на базе вядучых прамысловых прадпрыемстваў нашай краіны. На 2025 год ставім амбіцыйную задачу адкрыць не менш як 50 такіх класаў. Тады і заказчык кадраў, і ўстанова адукацыі, і навучэнцы будуць упэўнены, што яны атрымаюць тыя веды, кампетэнцыі і навыкі, якія неабходныя пры выхадзе на рынак працы.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота БелТА.

Даслоўна

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй Іванец:

— У краіне ствараюцца неабходныя ўмовы на ўсіх узроўнях адукацыі. Калі казаць пра ўніверсітэты, то сёлета для зручнасці абітурыентаў будзе запушчаны сэрвіс электроннай чаргі для падачы дакументаў у ВНУ. Кожны абітурыент, які будзе здаваць альбо цэнтралізаваны экзамен, альбо цэнтралізаванае тэсціраванне, у сваім асабістым кабінеце атрымае запрашэнне ўзяць адпаведны талончык. Упэўнены, гэта дазволіць істотным чынам знізіць нагрузку на прыёмныя камісіі і выключыць чэргі пры падачы дакументаў.

Таксама на 2025 год ставім сур'ёзную задачу перавесці ў электронны фармат такія адміністрацыйныя працэдуры, як пастаноўка на ўлік ва ўстановы дашкольнай адукацыі і выдача накіраванняў, каб у бацькоў не было неабходнасці выходзіць нават у службу «адно акно».

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС, ЗЯМЕЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І... ЛАЗНЯ

З якімі пытаннямі звярталіся людзі да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна?

Днямі старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў асабісты прыём грамадзян. Пытанняў да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна традыцыйна шмат, прычым абсалютна розных.

Кіраўнік прыватнага прадпрыемства Аляксандр Мікалаевіч з Беразіно расказаў пра ініцыятыву будаўніцтва ў горадзе аўтамыйкі самаабслугоўвання з шынамантажом. Найбліжэйшы такі аб'ект размешчаны ў Чэрвені. Аднак мясцовы райвыканкам дазволу на будаўніцтва аб'екта ў непасрэднай блізкасці да аўтавакзала, дзе, на думку заяўніка, ён павінен размясціцца, не дае. Прычына адмовы — незадаволенасць жыхароў дома, што знаходзіцца побач. Пры гэтым кіраўніцтва раёна прапануўвае заяўніку пабудаваць аб'ект на тэрыторыі мясцовага аўтапарка.

Аляксандр Турчын, выслухаўшы меркаванні заяўніка і райвыканкама, даручыў вырашыць пытанне на працягу месяца. А да прыняцця канкрэтнага рашэння мясцовым органам улады неабходна правесці апытанне жыхароў дома, размешчанага побач з аўтавакзалам, а таксама падаць план аб'екта з мэтай інфармавання насельніцтва ў мясцовай газеце, яшчэ раз арганізаваць сустрэчу з людзьмі, каб прыняць канчатковае рашэнне.

Жыхарка сталіцы Таццяна Іосіфаўна валодае зямельным участкам у вёсцы Пралынікі Валожынскага раёна. На дадзеным участку ў яе цяпліца і градкі, аднак жанчына жадае ўзвесці дом, каб пасля ў якасці пастаяннага жыхара вярнуцца на сваю малую радзіму. Толькі дазволу на змяненне мэтавага прызначэння зямельнага ўчастка, вылучанага пад вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі, атрымаць ніяк не можа: Валожынскі райвыканкам матывуе адмову тым, што побач праходзіць водаахоўная зона, а таксама магчымымі праблемамі з электразабеспячэннем будучага дома.

«На ўчастку плошчай 68 сотак дом можна ўзвесці ў любым куточку, не ў прыбярэжнай паласе, таму нішто не перашкаджае змяніць мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка. Аднак пры будаўніцтве дома ўладальнікам неабходна ўлічваць аб'ём выдзеленай магутнасці электразабеспячэння ў памеры 6 кВт», — сказаў Аляксандр Турчын.

Юлія Барысаўна і Аляксандр Барысавіч з Фаніпаля больш за 10 гадоў таму купілі ўчастак пад будаўніцтва дома ў мікрараёне Паўднёвы-2. Тады там не было ні дарог, ні транспартных зносін. Муж і жонка вырашылі, што гэта часовыя нязручнасці. Аднак і сёння ў Паўднёвым-2 — бездарожжа.

Старшыня Мінскага аблвыканкама адзначыў, што ў апошнія гады ў развіццё Фаніпаля былі ўкладзены немалыя сродкі, у горадзе ўзведзены новыя аб'екты — сад, ФАК. «Абяцаць, што цягам года ўсе дарогі ў мікрараёне будуць заасфальтаваны, мы не можам. Аднак частка асноўных дарог, каб з'явілася магчымасць пусціць грамадскі транспарт у Паўднёвы-2, будзе зроблена. Тэрмін ставім да 1 ліпеня. Але і мясцовае насельніцтва магло б прыняць удзел у агульным добраўпарадкаванні», — лічыць Аляксандр Турчын.

Мінчанін Рэзо Іванавіч некалькі гадоў таму ўзяў у арэнду будынак лазні, размешчаны ў вёсцы Камсамолец Мінскага раёна. Праз час захацеў набыць аб'ект ва ўласнасць, каб зноў адкрыць грамадскую лазню, аднак яму адмовілі. «Мне кажуць, што прадаць яго не могуць, бо будынак аварыйны. Добра, прадайце як аварыйны, я згодны. Але яго ж ацанілі ў 65 тысяч рублёў, яно столькі не каштуе! Я разумею, што за адну базавую будынак ніхто не прадасць, але і не за такія ж грошы!»

Старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч патлумачыў: кошт будынка выстаўлены з улікам рамонту, які зрабіў сам арандатар. Але зрабіў самавольна, не ўзгадніўшы з уласнікам. Аляксандр Турчын прапанаваў некалькі варыянтаў вырашэння праблемы: «Сёння вашы траты на рамонт складана ўлічыць: даказаць, што гэта менавіта вашы ўкладанні. Будзе праведзена паўторная ацэнка будынка, тады можна набыць яго шляхам прамога продажу. Альбо лазня выстаўляецца на аўкцыён, тады першапачатковая стаўка будзе ніжэйшай за ацэначную. Але майце на ўвазе: хтосьці іншы можа захацець купіць аб'ект».

***

Набыццё ва ўласнасць арандаванага аб'екта, завяршэнне будаўніцтва шматкватэрнага жылога дома ў Мінскім раёне, шматгадовыя бытавыя канфлікты — звярталіся на прыём да кіраўніка вобласці і з такімі пытаннямі. Кожная праблема будзе дэталёва вывучана спецыялістамі з мэтай пошуку найбольш аптымальнага рашэння.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

ООО «Деловая оценка»
(организатор аукциона)
по поручению Добрушского РайПО (продавец)
извещает о проведении **5 марта 2025 года**
открытого повторного аукциона по продаже
имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель,
ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот №1: капитальное строение с инв. № 311/С-52032 общей площадью 152,9 кв. м, наименование — магазин № 8, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321280801601000033 площадью 0,0858 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, п. Красный Алес; капитальное строение с инв. № 311/С-51817 общей площадью 85,8 кв. м, наименование — магазин, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — одноэтажное кирпичное здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286401601000022 площадью 0,0579 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Переростовский с/с, п. Лебедевка, магазин № 12. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 2 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 10 125,00 бел. руб.
Задаток – 101,25 бел. руб.

Лот № 2: капитальное строение с инв. № 311/С-52039 общей площадью 768,1 кв. м, наименование — магазин № 17, магазин № 9, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — двухэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: тремя крыльцами, гаражом, погребом, уборной, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321284006601000213 площадью 0,4407 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Крупецкий с/с, аг. Крупец, ул. Советская, магазин № 17, магазин № 9. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 17 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 42 406,00 бел. руб.
Задаток – 424,06 бел. руб.

Лот № 3: капитальное строение с инв. № 311/С-50123 общей площадью 1646,1 кв. м, наименование — магазин № 12 «Стройматериалы», назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — А1/кп-основное строение, Б1/кп-пристройка, 1-навес с рампой, 2-склад, а-рампа, б-навес, е-ворота, и-калитка, в-покрытие, к-ограждение, ж-ворота, г-ворота, д-ворота, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000397 площадью 0,6386 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Первомайская, 87.

Начальная цена продажи без НДС – 318 000,00 бел. руб.
Задаток – 3 180,00 бел. руб.

Лот № 4: капитальное строение с инв. № 311/С-52706 общей площадью 260,4 кв. м, наименование — столовая, назначение — здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности — сарай, уборная, 4 крыльца, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286403101000001 площадью 0,1770 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Переростовский с/с, аг. Перерост, пер. Центральный, 6. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 27 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 17 520,00 бел. руб.
Задаток – 175,20 бел. руб.

Лот № 5: капитальное строение с инв. № 311/С-51810 общей площадью 389,9 кв. м, наименование — склад солей, назначение — здание специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности — одноэтажный кирпичный склад, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100002000394 площадью 0,1091 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Торговая, склад солей.

Начальная цена продажи без НДС – 29 200,00 бел. руб.
Задаток – 292,00 бел. руб.

Лот № 6: капитальное строение с инв. № 311/С-50660 общей площадью 676 кв. м, наименование — магазин № 52, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — одноэтажное, состоящее из кирпича и железобетонных панелей здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321283201601000117 площадью 0,1379 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Круговец-Калининский с/с, аг. Круговец-Калинино, ул. Ленина В. И. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 12 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 60 085,00 бел. руб.
Задаток – 600,85 бел. руб.

Лот № 7: капитальное строение с инв. № 311/С-52028 общей площадью 119 кв. м, наименование — магазин № 15, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — одноэтажное кирпичное с тамбуром и крыльцом здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321286801601000124 площадью 0,0390 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Усохо-Будский с/с, д. Усохская Буда, ул. Садовая. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 13 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 11 212,50 бел. руб.
Задаток – 112,13 бел. руб.

Лот № 8: капитальное строение с инв. № 311/С-52015 общей площадью 184,6 кв. м, наименование — магазин № 3, назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности — одноэтажное кирпичное с двумя крыльцами здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275702601000088 площадью 0,0425 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, д. Нивки, магазин № 3. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды. Лот включает оборудование в количестве 10 ед.

Начальная цена продажи без НДС – 15 180,00 бел. руб.
Задаток – 151,80 бел. руб.

Продавец: Добрушское РайПО, г. п. Тереховка, ул. Советская, 30. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.
Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026. 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 04.03.2025 г. в 17.00,** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи не позднее **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу не позднее **10 (десяти) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

ДРАЙВЕРЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

За кошт чаго эканоміка выйшла на ўстойлівы трэнд росту і дзе яшчэ ёсць рэзервы

На бягучым тыдні прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА правёў пасяджэнне Савета Міністраў, у ходзе якога былі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2024 годзе. На першы погляд гэта звычайнае пратакольнае мерапрыемства, тым больш што статкамітэт яшчэ раней агучыў галоўны вынік мінулага года. У 2023—2024 гадах прынятыя сістэмныя рашэнні па забеспячэнні ўстойлівай работы галін далі магчымасць не толькі выйсці на ўстойлівы станоўчы трэнд асноўных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця нацыянальнай эканомікі, але і прадэманстраваць гадавыя тэмпы яе росту, вышэйшыя за сярэднесусветныя значэнні. Была захавана і макраэканамічная стабільнасць. Толькі золатавалютныя рэзервы за год павялічыліся амаль на 800 млн і на 1 студзеня гэтага года склалі амаль 9 млрд долараў. І ўсё гэта без пагаршэння сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы перад насельніцтвам, што ўжо даўно стала фірмавым брэндам Беларусі.

У той жа час, улічваючы, што бягучы 2025 год з'яўляецца заключным годам адыходзячай пяцігодкі, сёння прынцыпова важна не толькі яго годна завяршыць, але і зрабіць задзел, у тым ліку ў частцы вызначэння і рэсурснага забеспячэння стратэгічных прыярытэтаў, як на наступную пяцігодку якасці, так і на больш працяглы перыяд да 2040 года. Зыходзячы з апошняга тэзіса, прааналізуем фактары, якія дазволілі забяспечыць гэтыя, несумненна, добрыя вынікі не толькі ўрада і ўсёй вертыкалі ўлады, але і беларускіх працаўнікоў.

ТЭМПЫ РОСТУ ВУП ДА ЎЗРОЎНЮ 2023 ГОДА

Тэмп росту валавога ўнутранага прадукту (ВУП) за 2024 год склаў 104 % пры заданні 103,8 %. Драйверамі росту выступілі прамысловасць (105,2 %), будаўніцтва (108,9 %), транспарт (105,9 %), сельская гаспадарка (105,1 %), рознічны тавараабарот (111,8 %). Планы ўрадаў па дасягненні росту ВУП у 2025 годзе значэння 104,1 % пацвярджаюць жаданне захаваць апераджальныя тэмпы росту беларускай эканомікі, вышэйшай за сярэднесусветныя.

Даведка. *Паводле ацэнак экспертаў Сусветнага Банка, у 2025 годзе ў краінах з высокім узроўнем даходаў (G7) ВУП у сярэднім вырасце на 1,8 %. Пры тым у краінах з сярэднім і нізкім узроўнямі даходаў («Калектыўны Поўдзень») гэты паказчык дасягне адпаведна 4,1 % і 5,7 %.*

РОСТ РЭАЛЬНЫХ НАЯЎНЫХ ГРАШОВЫХ ДАХОДАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў 2024 годзе рэальныя даходы насельніцтва (маюцца на ўвазе тыя, якія былі «ачышчаны» ад уплывы інфляцыі) выраслі на 9,4 % пры прагнозе 3,5 %. У тым ліку рэальная заработная плата дасягнула амаль 2700 рублёў, што адпавядае 112 % адносна папярэдняга года.

На першы погляд тут назіраецца парушэнне базавага прынцыпу эканомікі: траціць трэба толькі тыя сродкі, якія былі раней зароблены. Аднак дэфіцыт працоўнай сілы ў суседніх рэгіёнах і краінах, асабліва тых, што ўжо маюць кампетэнцыі ў сферах прамысловасці і ІТ, вымушае кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў апераджальнымі тэмпамі стымуляваць сваіх работнікаў.

Даведка. *На 1 студзеня гэтага года толькі ў расійскай прамысловасці сфарміраваўся дэфіцыт з амаль 4,5 млн работнікаў, у тым ліку каля 600 000 інжынерна-тэхнічнага персаналу.*

«Штогод расійскі рынак працы прыцягвае значную колькасць беларусаў, што азначае недахоп працоўных рук у самой краіне. Тая ж праблема, што і ў Расіі. Нам патрэбна ўзгодненая палітыка ў гэтай сферы і дзейсныя прававыя механізмы, якія ўлічваюць інтарэсы абодвух бакоў», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на Вышэйшым дзяржсавеце Саюзнай Дзяржавы ў снежні мінулага года.

ІНВЕСТЫЦЫЙ Ў АСНОЎНЫ КАПІТАЛ

Пры мэтавым паказчыку 103,9 % у 2024 годзе дасягнуты рост 108 %. Структура інвестыцый палепшылася, большая іх частка накіравана ў абсталяванне і тэхналогіі, прырост укладанняў па гэтай катэгорыі перавысіў 40 %. У грашовым выяўленні аб'ём інвестыцый, накіраваных у абсталяванне, у 2024 годзе дасягнуў 5,5 млрд долараў супраць 3,7 млрд у 2022 годзе і 5,1 млрд у 2023 годзе. Раней на ўкладанні ў машыны і абсталяванне прыходзілася 35 % унутраных інвестыцый, цяпер — 40 %, а ў перспектыве ставіцца задача павялічыць гэты паказчык да 45 %. На думку спецыялістаў Мінэканомікі, інвестыцыі ў асноўны капітал неабходна павялічваць штогод не менш чым на 8-9 %. Вырашаць гэту задачу плануецца і шляхам стымулявання ўнутраных інвестыцый, і за кошт прыцягнення замежных прамых рэсурсаў з боку дружалюбных краін.

ЭКСПАРТ ТАВАРАЎ І ПАСЛУГ, САЛЬДА ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ

Пры мэтавым паказчыку 108 % па выніку 2024 года знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі склаў больш за 100 млрд долараў, або 105,1 %. У тым ліку экспарт тавараў і паслуг хоць і вырас да рэкордных 49 млрд долараў, ці на 3,5 %, ён не перавысіў аналагічнага паказчыка па імпарце (50,7 млрд долараў). У выніку сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склалася з дэфіцытам у памеры мінус 1,3 млрд долараў.

Гэта адзіны паказчык, па якім эканоміка не дасягнула планкі задання. Нягледзячы на тое што аб'ём паставак вырас на 1,7 млрд долараў, ці на 3,5 %, гэта ніжэй, чым ставілася задача — у 7,6 %. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што будзе няправільна спасылацца толькі на «нядбайных» кіраўнікоў прадпрыемстваў-экспарцёраў. Негатыўную ролю адыгралі і санкцыйная палітыка краін калектыўнага Захаду, якая дагэтуль набірае абароты, і неспрыяльная кан'юнктура на нашых традыцыйных рынках збыту. Прапанова Мінэканомікі ў частцы ўзмацнення кантролю за напаўненнем экспартных кантрактаў, несумненна, мае рацыянальнае зерне, але яго значэнне не трэба пераацэньваць. Больш важным уяўляецца нарошчваць нашу прысутнасць у рэгіёнах свету, якія найбольш дынамічна развіваюцца. І наш удзел у такіх інтэграцыйных структурах, як ШАС і БРІКС, павінен стаць такім драйверам.

Даведка. *У сусветнай эканоміцы ўдзельная вага экспарту ў ВУП складае 31,4 %. Аналагічны паказчык для Беларусі складае 65 %, г. зн. перавышае на дзве трэці (прамысловы комплекс — 3/4 усяго экспарту). Згодна са звесткамі Сусветнага Банка, па паказчыку долі экспарту тавараў і паслуг у ВУП Беларусь займае 14-е месца ў свеце. Расія — на 101-м месцы (28 %), ЗША — 142-м (14 %).*



У якасці вынікаў мінулага года і перспектыў на наступны перыяд можна прывесці вытрымкі з Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, зацвярджанай на сёмым Усебеларускім народным сходзе: «У Беларусі сфарміраваны і ўдасканальваюцца неабходныя ўмовы і магчымасці для прадухілення і нейтралізацыі пагроз нацыянальнай бяспецы. Сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі адаптаваная пад рэаліі абстаноўкі, функцыянуе ўстойліва і забяспечвае вырашэнне пастаўленых задач. Рэалізаваная ў Рэспубліцы Беларусь мадэль сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі даказала сваю жыццяздольнасць. У поўнай меры забяспечваецца харчовая бяспека, дынамічнае развіццё атрымалі прамысловасць і сфера паслуг».

Наколькі рэалізуюцца гэтыя канкурэнтныя перавагі ў маючы адбыцца адназначна вельмі няпросты перыяд турбулентнасці сусветнай эканомікі, будзе залежаць ад усіх нас — пачынаючы з чыноўнікаў і заканчваючы простымі грамадзянамі каля станка і на полі.

Георгій ГРЫЦ,
кандыдат эканамічных навук.

ЗДАРОЎЕ

З ДАКЛАДНАСЦЮ ДА МІЛІМЕТРА

Каля чвэрці аперацый, якія праводзяцца ў РНПЦ дзіцячай хірургіі, высокатэхналагічныя

У год тут праходзяць лячэнне больш за сем тысяч пацыентаў, звыш пяці тысяч з іх аперыруюцца.

Самы маленькі прааперыраваны тут пацыент важыў усяго 530 грамаў. А нованароджанаму масай 1,5 кг была выканана аперацыя на адкрытым сэрцы з яго спыненнем і паспяховым запускам пасля ўмяшання. Зрэшты, большасць кардыяхірургічных аперацый — 57 % — тут праводзіцца без разрэзаў — эндаваскулярна. Смяротнасць пацыентаў пасля такіх аперацый ніжэйшая, чым у найлепшых клініках Паўночнай Амерыкі і Еўропы, — летась яна склала ўсяго 1,5 %. Складана ўявіць, але такіх вынікаў дзіцячыя хірургі дасягнулі за адносна непрацяглы тэрмін — сёлета РНПЦ дзіцячай хірургіі спаўняецца 10 гадоў.

50 АПЕРАЦЫЙ ШТОДЗЕНЬ

Тут дапамагаюць дзецям па трох кірунках: кардыяхірургія і парокі сэрца, дзіцячая хірургія (парокі развіцця грудной, брушной поласцей, усе вострыя хірургічныя захворванні, апендыцыты, грыжы, усе гнойныя захворванні), эндаскапія. У сярэднім за год у РНПЦ звяртаюцца каля 45—50 тысяч пацыентаў. У асноўным дзіцячыя хірургі займаюцца пацыентамі да 18 гадоў.

Летась праз спецыялістаў цэнтра прайшлі 46,4 тысячы пацыентаў. Былі шпіталізаваныя і атрымалі лячэнне, у асноўным у выглядзе аперацый, 7,6 тысячы пацыентаў. Аналагічныя паказчыкі — 7—7,5 тысячы дзяцей за год — назіраюцца на працягу некалькіх апошніх гадоў.

— Летась мы зрабілі 5850 аперацый — каля 50 штодзень. На мой погляд, гэта даволі сур'ёзная лічба. І гэта не толькі аперацыі накшталт апендыцыту, грыжы, але і сур'ёзныя эндаваскулярныя, эндаскапічныя і аперацыі на сэрцы, якія доўжацца па 5, 6, 7, 8, 10 гадзін, — адзначыў **дырэктар РНПЦ дзіцячай хірургіі Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ.** — З ліку ўсіх аперацый 25 % былі высокатэхналагічнымі. Гэта ўмяшанні, якія выкананы з выкарыстаннем самага сучаснага абсталявання, найбольш кваліфікаванымі хірургамі, як правіла, яны дастаткова рэдкія.

Самае галоўнае пры гэтым — каб дзеці заставаліся жыць. За апошнія гады пасляаперацыйную смяротнасць удалося знізіць. У мінулым годзе гэты паказчык склаў 0,39. Калі параўноўваць з папярэднімі гадамі, то ў 2023-м лятальнасць была 0,6, у 2022-м — 0,5, у 2021-м — 0,7. Калі браць кардыяхірургічныя аперацыі, а менавіта дзеці з хворым сэрцам гінуць найчасцей, то ў 2016 годзе смяротнасць складала 3,5 %, у 2017-м — 2 %, 2020—2021 — 2,5—3,5 %, летась — 1,5 %.

Такім чынам, летась супрацоўнікі цэнтра дабіліся ўнікальных вынікаў.

— Гэта заслуга калектыву, прафесіяналаў, якія ў нас працуюць. Адназначна гэта заслуга дзяржавы, якая забяспечвае наш цэнтр усім неабходным для работы. Мы не можам сказаць, што сёння нам чагосьці не хапае, каб дапамагчы дзіцяці ў любой сітуацыі — хірургічнай і не толькі, — падкрэсліў Канстанцін Драздоўскі.

У тэму

Колькасць замежных пацыентаў летась выросла ў тры разы

Як адзначыў Канстанцін Драздоўскі, у РНПЦ дзіцячай хірургіі прыязджаюць аперыравацца дзеці з іншых краін. За апошні год колькасць такіх пацыентаў выросла ў тры разы. Пераважна гэта дзеці з краін Сярэдняй Азіі і Расіі. А брыгады беларускіх хірургаў выязджаюць аперыраваць за мяжу: у Казахстан, Узбекістан, Кыргызстан, Расію, працавалі яны і ў рамках аналагічных сумесных праграм з Грузіяй і ААЭ.

МАЛАІНВАЗІЙНЫЯ ЎМЯШАННІ

Намеснік дырэктара РНПЦ дзіцячай хірургіі па лячэбнай рабоце Аляксандр СВІРСКІ адзначыў, што сёння ў свеце развіваецца такі кірунак, як мініінвазійныя ўмяшанні. Гэта распрацоўкі апошніх 20—30 гадоў, якія ўдалося ўкараніць з развіццём тэхнічных магчымасцяў. Менавіта гэта дазваляе зменшыць траўматычнасць, скараціць тэрміны аднаўлення і знаходжання ў стацыянары, што асабліва важна ў дзіцячым узросце.

— Са станаўленнем нашага цэнтра мы прыйшлі да мэты, якая была пастаўлена пры яго фарміраванні: прытрымлівацца ўсіх сусветных тэндэнцый у дзіцячай хірургіі, якая развіваецца ў вядучых краінах. І на сёння мы можам сказаць, што ў цэнтры дзіцячай хірургіі прадстаўлены ўсе віды хірургічных умяшанняў, якія выконваюцца як у еўрапейскіх, так і паўночнаамерыканскіх клініках, дзе займаюцца дзіцячай хірургіяй, — дадаў Аляксандр Свірскі.

У 2015 годзе, калі быў створаны РНПЦ, тут выканалі 500 мініінвазійных умяшанняў, цяпер за год іх — каля 2 тысяч. Гэта розныя віды ўмяшанняў: торакаскапічныя, лапараскапічныя, эндаскапічныя. Сярод іх — шэраг аперацый, распрацаваных і асвоеных спецыялістамі цэнтра. У прыватнасці, апошнім часам хірургі асвойваюць новыя аперацыі, якія раней не выконваліся, — на трахеі, бронхах, лёгкіх.

РНПЦ дзіцячай хірургіі цесна супрацоўнічае з РНПЦ «Маці і дзіця», дзе выходжваюць дзяцей з экстрэмальна нізкай масай цела. Такія дзеці з парокамі развіцця аперыруюцца пасля нараджэння ў цэнтры хірургіі.

— Кошт такога лячэння дастаткова высокі. Урачэбныя і сястрынскія затраты па доглядзе і выходжванні дзетак таксама велізарныя. І калі праз годдва такія дзеці прыходзяць з бацькамі да нас у госці, усміхаюцца дактарам і медсёстрам, мы адчуваем, што сваю задачу выканалі, — адзначыў Аляксандр Свірскі.

Алена КРАВЕЦ.

Тым часам

У Магілёўскай гарадской бальніцы пачаў дзейнічаць новы корпус

Новы васьміпавярховы корпус Магілёўскай клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі пабудаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. На яго ўзвядзенне было накіравана больш чым 180 мільёнаў рублёў. У ім прадугледжана ўсё для арганізацыі аказання экстраннай неадкладнай медыцынскай дапамогі новага фармату, для гэтага тут ёсць самае сучаснае абсталяванне.

Міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ, які азнаёміўся з магчымасцямі новага корпуса, падкрэсліў, што сёння беларуская медыцына аказвае дапамогу на сусветным узроўні.

— Усе даручэнні кіраўніка дзяржавы, якія мы выконваем ужо больш як 30 гадоў, дэманструюць клопат дзяржавы аб простых людзях, — сказаў ён. — На працягу многіх гадоў тэхналагічнае абсталяванне пастаўляецца не толькі ў бальніцы сталіцы, але і ў рэгіёны. Цяпер ідзе ўжо не дасканашчэнне, а пераабсталяванне. Тое абсталяванне, якое адпрацавала дзесяць гадоў, састарэла па сваіх тэхналагічных характарыстыках. За 2024 год з бюджэту было накіравана 500 мільёнаў рублёў на набыццё высокатэхналагічнага медабсталявання. Медыцына павінна ратаваць жыцці людзей, зніжаць смяротнасць і забяспечваць вельмі хуткае выздараўленне і рэабілітацыю. Гэта не новы ўзровень аказання дапамогі пацыентам, а сусветны вопыт, які мы сёння ўкараняем і будзем далей укараняць па меры яго паступлення.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА паведаміў, што на рамонт і будаўніцтва аб'ектаў аховы здароўя ў вобласці накіравана каля 170 мільёнаў рублёў. На абнаўленне медыцынскага абсталявання з абласнога бюджэту пайшло больш чым 30 мільёнаў рублёў. «Шмат увагі ўдзяляецца і самім медработнікам, — сказаў губернатар. — Для іх у Магілёве пабудавалі арэндны дом. Сёлета такі ж дом будзе здадзены ў Бабруйску. Усё, што робіцца, — гэта планамерная работа для паляпшэння сістэмы аховы здароўя».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **Гродненскому областному потребительскому обществу** (Гродненский филиал).

Аукцион состоится **10.03.2025 г. в 11.00** по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000001008366 площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), находящимся по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43. Условия проведения аукциона: - оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; - расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя; - право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; - документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи
Начальная цена продажи	599 240,54 руб. (пятьсот девяносто девять тысяч двести сорок рублей пятьдесят четыре копейки) с учетом НДС
Сумма задатка	59 924 руб. (пятьдесят девять тысяч девятьсот двадцать четыре рубля)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений — 06.03.2025 г. до 15.00

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Дорстройиндустрия».**

Аукцион состоится **27.03.2025 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Лот № 1 в составе: 1. Операторская У-7810 4А, инв. № 4230; 2. ПИТАТЕЛЬ ВИБРАЦИОННЫЙ НА ОПО, инв. № 4223; 3. АГРЕГАТ МЕЛКОГО ДРОБЛЕНИЯ ДРО 7, инв. № 4224; 4. АГРЕГАТ МЕЛКОГО ДРОБЛЕНИЯ ДРО 7, инв. № 4225; 5. АГРЕГАТ СОРТИРОВКИ ДРО-690, инв. № 4226; 6. АГРЕГАТ СОРТИРОВКИ ДРО-690, инв. № 4227; 7. АГРЕГАТ ГРАНУЛЯЦИИ ДРО-630, инв. № 4228; АГРЕГАТ СОРТИРОВКИ ДРО-669, инв. № 4229; 9. ЖЕЛЕЗООТДЕЛИТЕЛЬ ЭЖС-80, инв. № 4231; 10. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151ЖЕЛ, инв. № 4232; 11. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151, инв. № 4235; 12. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151, инв. № 4239; 13. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151, инв. № 4241; 14. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151, инв. № 4242; 15. КОНВЕЙЕР СПЕЦИАЛЬНЫЙ СМД-151, инв. № 4243; 16. Агрегат сортировки СМД-513, инв. № 4295; 17. АГРЕГАТ МЕЛКОГО ДРОБЛЕНИЯ ДРО 7, инв. № 4252; 18. ПИТАТЕЛЬ ВИБРАЦ ДРО-605-20, инв. № 4254; 19. АГРЕГАТ СОРТИРОВКИ ДРО-690, инв. № 4256; 20. АГРЕГАТ ГРАНУЛЯЦИИ ДРО-630, инв. № 4260; 21. КОНВЕЙЕР СПЕЦ СМД-151-60, инв. № 4277; 22. КОНВЕЙЕР СПЕЦ СМД-151-60, инв. № 4278; 23. КОНВЕЙЕР СПЕЦ СМД-151-60, инв. № 4281; 24. КОНВЕЙЕР СПЕЦ СМД-151-50, инв. № 4286; 25. КОНВЕЙЕР СПЕЦ ДРО-596-10, инв. № 4292; 26. Конвейер СМД-151, инв. № 4111; 27. Конвейер 401520000, инв. № 4113; 28. Аспирационная система АС-1-1, инв. № 4513; 29. Аспирационная система АС-2-1, инв. № 4514; 30. Аспирационная система АС-3-1, инв. № 4515; 31. Конвейерный металлодетектор МД8, инв. № 47037; 32. Конвейерный металлодетектор МД8, инв. № 47038; 33. Конвейерный металлодетектор МД8, инв. № 47036; 34. ВАЛ ВЕРТИКАЛЬНЫЙ Б/У – 1 штука, номен. № 00000004210; 35. КОНУС ДРОБ СТ 110Г13Л С М/О Б/У – 6 штук, номен. № 00000004212; 36. КОНУС ДРОБЯЩИЙ УШИР С М/О Б/У – 6 штук, номен. № 00000004213; 37. ПОДПЯТНИК П-2671 Б/У – 3 штуки, номен. № 00000004214; 38. ШЕСТЕРНЯ 4830506001 Б/У – 1 штука, номен. № 00000004215; 39. ШЕСТЕРНЯ 4856007024 Б/У – 1 штука номен. № 00000004216.

Начальная цена без НДС – 245 000,00 руб. Задаток – 24 500,00 руб.
Место нахождение: 222750, Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37.

Шаг аукциона – 5 %. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 25.03.2025 в 11.00

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, gostorg.by, e-mail: torgi@ino.by

ВЫВУЧАЦЬ, ШАНАВАЦЬ, КАРЫСТАЦЦА



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У дыскусіі ўдзельнічалі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў, доктар гістарычных навук, Вольга ЗЕЛЯНКО, прарэктар па навуковай рабоце ДУА «Акадэмія адукацыі», доктар педагагічных навук, Ігар КАПЫЛОЎ, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, Алена ЛАПЦЁНАК, загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук, Вераніка КУРЦОВА, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук, Георгій ЧАХОЎСКІ, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат філалагічных навук, Ганна КУЛЕШ, прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ, доктар філалагічных навук, Наталля СУДЗІЛОЎСКАЯ, начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкіх работ Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі.

КЛЮЧАВОЕ АЗНАЧЭННЕ — «ДЗЯРЖАЎНАЯ»

«Звязда»: Тэма нашай сённяшняй размовы можа выклікаць заўвагу скептыкаў: маўляў, а навошта ўжыванне беларускай мовы пашыраць? У школе яна вывучаецца, размаўляць на ёй можа кожны дзе і колькі заўгодна. Да таго ж у нас ёсць яшчэ адна дзяржаўная мова, адна з шасці міжнародных, лексікі якой хопіць на ўсе выпадкі жыцця...

Ігар Капылоў: Так, мы нярэдка чуем падобныя скептычныя заўвагі. Але тут мы павінны зыходзіць з дзяржаўных пазіцый. А дзяржаўная пазіцыя на сёння такая: адраджэнне, захаванне духоўных каштоўнасцяў, выхаванне патрыятызму — адна з асноў суверэнітэту, жыццяздольнасці дзяржавы. Прэзідэнт гаворыць, што наша задача — зрабіць так, каб нашы дзеці і ўнукі сталі захавальнікамі культурнага кода нацыі. І адзін з найважнейшых складнікаў гэтага кода — наша мова, якая адрознівае нас ад іншых. Ці былі б сёння беларусы, калі б не беларуская мова? Мова — гэта аснова нацыянальнай самасвядомасці і станаўлення дзяржаўнасці... У нас ёсць дзяржаўная праграма «Грамадства і гуманітарная бяспека дзяржавы», і ў ёй цэлая падпраграма «Беларуская мова і літаратура», у рамках якой на працягу пяці гадоў (сёлета яна завяршаецца) выконвалася восемдзясят тэм. Усе скіраваныя на даследаванне беларускай мовы ў розных яе аспектах: сучасны стан, гісторыя, народныя гаворкі, тэрміналогія, камп'ютарная лінгвістыка і інш.

Вячаслаў Даніловіч: У свой час вельмі прыгожа і трапна сказаў аб нашых дзяржаўных мовах Прэзідэнт: калі мы хочам пазбавіцца розуму — адмовімся ад рускай мовы, калі хочам пазбавіцца душы — адмовімся ад беларускай... Так склалася гісторыя беларускага народа, так склалася фарміраванне нашай дзяржаўнасці, нашай нацыі, што ў нас ёсць двухмоўе, але гэта трэба ўспрымаць не як нейкую складанасць, а як наша багацце. На сёння гэта аб'ектыўная данасць: у нас ёсць дзве дзяржаўныя мовы, кожную з іх мы павінны ведаць. Але калі гаварыць пра беларускую нацыю, пра яе захаванне, тут трэба казаць найперш пра захаванне беларускай мовы адназначна, бо яна адзін са складнікаў, якія і робяць нас нацыяй.

«Звязда»: Што ўтойваць, у нашым грамадстве ёсць такое меркаванне: калі беларуская мова — мова душы, значыць, гэта песні, казкі, вершы... А мова навукі, мова тэхналогій, мова заканадаўства — гэта не пра яе. Навошта, калі ёсць яшчэ адна дзяржаўная, у якой добра развіта гэта тэрміналогія, якую і так усе разумеюць...

Ігар Капылоў: Цяпер наш інстытут сумесна з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі ажыццяўляе пераклады з рускай мовы на беларускую дакументаў Еўразійскай эканамічнай камісіі. На сёння перакладзена больш за 1500 міжнародных дагавораў, актаў органаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэта даволі складаныя тэксты. Хтосьці можа сказаць: «Навошта? Ёсць жа руская мова... Але калі ў ЕЭК ёсць дакументы на кыргызскай, казахскай, армянскай мовах, яны павінны быць на беларускай у абавязковым парадку! Гэта ні больш ні менш справа прэстыжу дзяржавы. А для нас гэта карысна тым, што мы развіваем мову, удасканальваем тэрміналогію, якая ў гэтых дакументах розная: і фізічная, і тэхнічная, і медыцынская...

«Звязда»: А большасць законаў у нас ад пачатку прымаюцца па-руску...

Вячаслаў Даніловіч: Законы прымаюцца на той з дзяржаўных моў, на якой падаюць іх распрацоўшчыкі. Мы жывём у рэчаіснасці білінгвізму, паўтаруся: так склалася наша гісторыя, руская мова сёння больш пашырана ў нашым грамадстве. Дарэчы, не ўсе законы прымаюцца па-руску, напрыклад, Кодэкс аб культуры ад пачатку падаваўся распрацоўшчыкамі на беларускай мове. Так, на беларускай мове законапраекты паступаюць радзей, чым па-руску. Але гэта адлюстроўвае тую моўную сітуацыю, якая ёсць на сёння ў нашым грамадстве. Спецыялісту прасцей рыхтаваць нарматыўныя акты на той мове, якой ён больш карыстаецца.

Ганна Кулеш: Але закон аб мовах прадугледжвае для служачых валоданне абедзвюма дзяржаўнымі мовамі на тым узроўні, які дазваляе ім выконваць свае службовыя абавязкі.

Вячаслаў Даніловіч: Калі вы звяртаецеся ў дзяржаўны орган на беларускай мове, вам павінны адказаць па-беларуску. У Акадэміі кіравання на факультэце перападрыхтоўкі чытаецца спецыяльны курс для службовых асоб па беларускай мове і яе ўжыванні. Гэта ў нас забяспечваецца. Але прымусіць спецыяліста падаваць законапраект менавіта па-беларуску немагчыма, бо ў нас замацавана ў Канстытуцыі двухмоўе... Калі мы адэкватна, у павазе да беларускай мовы, ва ўсведамленні неабходнасці яе ведаць на належным узроўні, будзем выхоўваць маладое пакаленне, несумненна, калі яны прыйдуць на дзяржаўную службу, то будуць мовай карыстацца. Тут усё пачынаецца з сям'і, са школы, з кожнага з нас.

Ганна Кулеш: Ужо больш за 20 гадоў я займаюся праблемай мовы беларускага заканадаўства. Я прачытала ўсе кодэксы ўсіх рэдакцый на беларускай і рускай мовах. Пачынаючы ад Канстытуцыі РСФСР 1918 года, якая была перакладзена ў Маскве на беларускую мову з мэтай пашырэння ідэй сацыялізму. На працягу ўсяго XX стагоддзя кодэксы і папраўкі да кодэксаў у савецкай Беларусі друкаваліся паралельна на беларускай і рускай мовах, прычым беларускамоўны тэкст таксама меў юрыдычную сілу. Пра гэта сведчыць выхад не толькі рускамоўных, але і беларускамоўных тэкстаў у дзяржаўных выдавецтвах, а таксама пазначэнне іх у бібліяграфічным запісе як афіцыйнага выдання.

Наталля Судзілоўская: Гэтыя пераклады ёсць і сёння, і запыт ад дзяржавы на іх ёсць. Напрыклад, распараджэннем кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта для перакладу на беларускую мову тэксту праекта змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, вынесенага на рэспубліканскі рэферэндум, была створана рабочая група. Яна літаральна ў трохдзённы тэрмін забяспечыла пераклад тэксту праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, а таксама прывядзенне яе ў кантрольны стан. Па выніках гэтай работы выйшлі ў свет друкаваныя выданні Канстытуцыі на беларускай мове, выпушчаныя нашым цэнтрам (гэта Канстытуцыя на трох мовах: рускай, беларускай і англійскай), а таксама Выдавецкім домам «Звязда». У 2023 годзе цэнтр для забеспячэння правядзення выбарчай кампаніі таксама выдаў Канстытуцыю на рускай і беларускай мовах, якая ўручалася на выбарчых участках тым, хто галасаваў упершыню. Гэта зладжаная, добра скаардынаваная работа стала вынікам вопыту, набытага ў працэсе працы ў экспертным савеце па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову.

«Звязда»: Гэта работа вядзецца ўжо даволі даўно: тэма перакладу заканадаўства на беларускую мову ўзнікла падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» у сакавіку 2019 года. Тады кіраўнік дзяржавы даў даручэнне заняцца гэтым пытаннем...

Наталля Судзілоўская: ...І фактычна адразу мы ўзяліся за справу. Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі распрацаваў механізм перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову. Пры цэнтры быў створаны экспертны савет па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову, у які ўвайшлі прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнай акадэміі навук, Палаты прадстаўнікоў, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства культуры, у той час яшчэ Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, галоўных устаноў вышэйшай адукацыі краіны і іншых арганізацый. Савет працуе на добраахвотнай аснове і праводзіць ацэнку якасці зробленага перакладчыкамі перакладу кодэксаў. Першым перакладзеным кодэксам стаў Кодэкс аб шлюбе і сям'і. Вопыт яго перакладу паказаў, як старанна трэба выбіраць тэрміналогію для такіх актаў. Упершыню ў заканадаўстве быў замацаваны тэрмін «сужэнцы». Напярэдадні выбараў дэпутатаў 2019 года быў перакладзены Выбарчы кодэкс, актуалізаваны ў 2023 годзе. Усяго за час работы экспертнага савета было перакладзена 20 кодэксаў, актуалізаваны Выбарчы кодэкс. Сёлета да перакладу плануецца яшчэ некалькі кодэксаў.

«Звязда»: У экспертным савеце (ведаю, бо сама ў яго ўваходжу) нярэдка вядуцца сур'ёзныя дыскусіі наконт правільнасці ўжывання таго ці іншага слова ці сказа...

Наталля Судзілоўская: Работа з заканадаўчымі дакументамі патрабуе не толькі ведаў моўных нормаў, але і цеснага супрацоўніцтва з юрыстамі. Часам адны і тыя ж паняцці ў розных нарматыўных дакументах маюць розніцу ў трактоўках. Акрамя таго, важна, каб тэрміналогія адпавядала двум асноўным прынцыпам — адназначнасці і сістэмнасці, не павінна быць сінанімію. Падчас работы над кодэксамі таксама ўлічваюцца сучасныя тэндэнцыі, таму што мова і прававая база пастаянна развіваюцца. Менавіта таму работа ўскладняецца шэрагам фактараў. У прыватнасці, паколькі кодэксы першапачаткова ствараліся на рускай мове, перакладчыкі былі вымушаны прытрымлівацца арыгінала, каб два тэксты карэлявалі паміж сабой. Пераклад гэтых дакументаў патрабуе не толькі выдатных ведаў лексічнай сістэмы прававога акта, але і глыбокага вывучэння і навуковага аналізу яго культурных аспектаў і сувязяў, гісторыі яго стварэння.

Вераніка Курцова: Тут яшчэ справа ў маўленчай практыцы. Калі дакумент не падмацаваны маўленчай практыкай, то як мы можам гаварыць, правільна або няправільна ўжыты той ці іншы тэрмін. Атрымліваецца, мы пры перакладзе тых жа нарматыўных дакументаў займаемся толькі прапановамі таго ці іншага варыянту ўжывання. Далей справа за ўжо згаданай маўленчай практыкай, якая прымае варыянт або не. А калі маўленчай практыкі няма — справа спыняецца на ўзроўні існуючага на паперы ці на спецыяльным партале перакладу. Якім вельмі мала хто карыстаецца...

Ганна Кулеш: Яшчэ пытанне: наколькі гэтымі перакладамі можна карыстацца ў правапрымяняльнай практыцы...

Наталля Судзілоўская: Так, у дадзеным выпадку пытанне ёсць, бо, згодна з адпаведнымі нарматыўнымі дакументамі, юрыдычнай сілай валодае пераклад, здзейснены тым органам, які прымаў гэты закон. Усе пераклады на іншую мову прававога акта (як, дарэчы, і пераклад ужо згаданага Кодэкса аб культуры на рускую мову) пазначаюцца рэмаркай «Неафіцыйны пераклад».

Ганна Кулеш: Магу ў гэтым кантэксце прывесці ў прыклад Татарстан, дзе дзяржаўныя мовы дзве — татарская і руская. У іх усе нарматыўныя акты маюць аднолькавую юрыдычную сілу ў абедзвюх рэдакцыях: на рускай і на татарскай мовах. Няўжо славянская і цюркская мовы бліжэйшыя, чым дзве ўсходнеславянскія? Нават калі ў беларускім перакладзе будзе «вытворчасць па справе» («производство по делу») замест «вядзенне справы» (як павінна быць) — няўжо не будзе зразумела, пра што ідзе размова? А што гаварыць пра нейкія іншыя тонкасці? Яны адшліфуюцца ў працэсе выкарыстання. Мова развіваецца ва ўжыванні.

Наталля Судзілоўская: Але галоўнае, што гэтыя пераклады ёсць. Праўда, яны пакуль сапраўды не вельмі запатрабаваныя... Колькасць наведвальнікаў на Нацыянальным прававым партале на рускай версіі ў разы большая, чым на беларускай.

Алена Лапцёнак: Сапраўды, яшчэ ёсць нейкі ментальны бар'ер: дзе трэба беларуская мова, дзе не трэба. Вось як яго пераадолець... Неабходна павышаць прэстыжнасць беларускай мовы, даводзіць, што беларуская мова — гэта таксама мова законаў, мова сучасных тэхналогій і моды, мова бізнесу і спорту. Ведаю многа праектаў па папулярызацыі мовы. У свой час паказы фільмаў з беларускамоўнай агучкай збіралі поўныя залы. Сёння вядомая журналістка і пісьменніца рыхтуе пераклад сваіх бестселераў на беларускую мову. І такіх прыкладаў хапае.

Вячаслаў Даніловіч: Паўтаруся: трэба пачынаць з сям'і і школы. Калі будзе ў бацькоў павага да мовы і разуменне, што яе трэба ведаць, — тады і дакументы юрыдычныя будуць запатрабаваныя, і перапіска на мове будзе весціся. Дзяржава дае неабмежаваныя магчымасці мову ведаць і вывучаць. Справа ў нас саміх.

ЯК ВУЧЫЦЬ, КАБ — ВЕДАЦЬ?

Вераніка Курцова: Навучанне — гэта працяглае засваенне, якое вымагае яшчэ і практычнага навыку, таму школа тут не створыць ідэальны падручнік і за адну ці дзве гадзіны на тыдзень мове не навучыць.

Вячаслаў Даніловіч: Тут не падручнікі галоўнае, і не колькасць гадзін. Галоўнае — настаўнік, які выкладае. Магу прывесці ў прыклад сваю дачку, якая, скончыўшы рускамоўную школу, здала тэсціраванне па-беларуску на 100 балаў. Так, мы як бацькі давалі ёй устаноўку, што мову трэба ведаць. Але ўсё ж галоўную ролю адыграў настаўнік, які сам любіць і ведае гэту мову, які здолеў зацікавіць і навучыць. А прымусіць кагосьці вывучаць мову ці гаварыць толькі на ёй немагчыма, і гістарычны досвед гэта даказвае...

«Звязда»: А калі казаць аб самім працэсе навучання... Давялося чуць, і неаднойчы, рэпліку ад тых жа бацькоў: беларускую мову вывучаць складана, бо дзеці не валодаюць лексікай, слоўнікавым запасам, а праграма школьная, граматыка, якая вывучаецца, разлічана менавіта на носьбітаў мовы. А якія спражэнні і скланенні, калі дзіця не ведае значэння слоў? Можа, варта пераглядаць методыкі выкладання, пачынаць вывучаць беларускую мову як замежную?

Вольга Зелянко: Ні ў якім разе гэтага нельга рабіць! Методыка навучання беларускай мове — вельмі сур'ёзная навука, якая даследуе ў тым ліку заканамернасці маўленчага развіцця дзіцяці, засваення мовы. Як толькі мы станем у Беларусі вывучаць беларускую мову як замежную, мы дапусцім вялізную педагагічную і метадычную памылку. У выкладанні замежнай мовы дзейнічаюць спецыфічныя лінгвадыдактычныя, нейралінгвістычныя, псіхалагічныя механізмы. Мне пашчасціла працаваць настаўнікам, у тым ліку ў пачатковай школе, і я ведаю сістэму моўнай адукацыі ад этапу пачатковага навучання. У маім класе (а гэта была школа з беларускай мовай навучання) у свой час вучыўся нават маленькі кубінец, у якога спачатку, зразумела, не было ніякага беларускамоўнага слоўнікавага запасу. Аднак праз год навучання запіскі дзяўчынкам-аднакласніцам ён пісаў па-беларуску.

Георгій Чахоўскі: Вывучаць беларускую мову як замежную — гэта не тое што непажадана, гэта бессэнсоўна і дэструктыўна. Розныя алгарытмы засваення роднай мовы і замежнай. А беларуская мова — родная на генетычным узроўні. Родную мову мы вывучаем неўсвядомлена — шляхам пераймання, асабістай зацікаўленасці, праз добры прыклад. Лінгвадыдактычнай аксіёмай стала дыферэнцыяцыя методык выкладання мовы (як роднай, так і замежнай). Калі вывучэнне роднай мовы патрабуе звяртаць увагу на форму выказвання думкі, то вывучэнне замежнай мовы прадугледжвае засваенне не толькі моўнай формы, але і адпаведнага ёй сэнсавага напаўнення.

Вольга Зелянко: Стварэнне маўленчага асяроддзя — ключавая ўмова засваення любой мовы. І маўленчае асяроддзе павінна ствараццa як у сям'і, так і ў школе. У такім выпадку не будзе ніякіх перашкод для натуральнага, непрымусовага засваення мовы. А набыццё лексічнага запасу — увогуле не праблема для дзяцей. У маёй практыцы быў забаўны выпадак. Маленькія дзеці вывучалі слова «бусел», знаёміліся з аднакаранёвымі словамі. Я прапанавала ім адказаць, што такое «буслянка». І другакласнікі пачалі даваць варыянты: і жонка бусла, і хата бусла, і нават суп з бусла! Уключылася вобразнае мысленне, запрацавалі словаўтваральныя мадэлі. Ці можаце вы ўявіць такое пры вывучэнні замежных моў?..

«Звязда»: Немалую ролю тут іграюць і падручнікі, і проста кнігі на беларускай мове, нават іх знешні выгляд, які павінен быць сучасным...

Ігар Капылоў: Супрацоўнікі сектара камп'ютарнай лінгвістыкі нашага інстытута ствараюць тлумачальны слоўнік для школьнікаў. Нестандартны дызайн, даволі нетрывіяльныя простыя тлумачэнні. Да канца года, спадзяёмся, гэта праца будзе завершана. Мы таксама падрыхтавалі акадэмічнае выданне «Беларуская мова ад А да Я», зробленае ў навукова-папулярным жанры. Кніга арыгінальна афармлена, утрымлівае шмат цікавых фактаў пра мову. Прынамсі, кожны, хто з ёй азнаёміцца, пераканаецца, што беларуская мова — старажытная, а не штучна створаная, багатая, са сваёй адметнай лексікай і фразеалогіяй. Упэўнены, што кожны, хто ўважліва прачытае гэту кнігу, зразумее, што з вялікім шанаваннем трэба ставіцца да нацыянальнай мовы. Любіць родную мову — значыць любіць сваю краіну.

Вольга Зелянко: Згадайце, што раней было намалявана на вокладках нашых падручнікаў па беларускай мове і літаратуры. Вясковая хата, сельскі пейзаж — фактычна адсылка да таго, што беларуская мова — гэта мова вёскі. А сёння ключавы пасыл, нават пачынаючы з вокладкі падручніка, — паказаць, што валодаць беларускай мовай — гэта модна, прэстыжна, сучасна. Сёння на вокладках школьных падручнікаў па беларускай мове — выявы помніка «Ў» у Полацку, фантана «Беларусь» на плошчы Незалежнасці ў Мінску, скульптуры «Беларусь гасцінная» каля Палаца Незалежнасці. Пра гэтыя скульптурныя кампазіцыі ў падручніках ёсць цікавыя тэксты, а заданні да іх накіраваны на развіццё функцыянальнай адукаванасці вучняў, здольнасці карыстацца беларускай мовай у штодзённым жыцці. Бацькі, якія не валодаюць методыкай навучання мове, часам пытаюць: навошта ў падручніку па мове выява табло на чыгуначным вакзале? А для таго, каб, вывучаючы лічэбнікі, дзеці набылі вопыт іх ужывання ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях: «У які час мне трэба выехаць з Мінска, каб прыбыць у Брэст да 15 гадзін...»

ХТО СТВАРАЕ КАМУНІКАТЫЎНАЕ АСЯРОДДЗЕ?

«Звязда»: Амаль творчы працэс атрымліваецца. І ролю настаўніка тут сапраўды цяжка пераацаніць. Але ці можам мы ў дастатковай колькасці падрыхтаваць такіх настаўнікаў, калі ўлічыць, што філфак, ды яшчэ і беларускі, — не самы прэстыжны сярод абітурыентаў факультэт...

Георгій Чахоўскі: Настаўнік, сапраўды, сёння не толькі рэтранслятар вучэбнай дысцыпліны, якую ён выкладае, але і праваднік духоўнасці, праваднік ідэй, праваднік дзяржаўнага патрыятызму. Нам усім трэба правесці гуманітарную перазагрузку, каб паглядзець на вывучэнне беларускай мовы менавіта з гэтай пазіцыі...

Мне цяпер даводзіцца працаваць з першакурснікамі, і я на сёння бачу іх зацікаўленасць стаць добрымі настаўнікамі. Гэтыя студэнты размаўляюць па-беларуску не таму, што яны вывучаюць мову як абавязковую дысцыпліну, а таму, што самі адчуваюць патрэбу ў гэтым. Выкладчык беларускай мовы — гэта чалавек, які працуе над сабой на працягу ўсяго прафесійнага жыцця, — вось што мы стараемся данесці да нашых студэнтаў. Перспектывы ў нас у гэтым плане добрыя. Да нас прыходзяць студэнты матываваныя, якія хочуць вучыць дзяцей і быць сапраўднымі Настаўнікамі.

Дарэчы, у нас на філфаку вучацца і замежныя студэнты, і сярод іх назіраецца павышэнне цікавасці да вывучэння менавіта беларускай мовы...

Ганна Кулеш: А ў маёй прыктыцы быў выпадак, калі кітайскага студэнта, які захацеў вывучаць беларускую мову, нашы паднялі на смех: ты што, дурань, мы ў Беларусі мову не ведаем, а табе навошта?..

Вольга Зелянко: І чым гэта сітуацыя з вашага боку завяршылася, калі вы пра яе даведаліся? Абурэннем?

Ганна Кулеш: Не, не абурэннем. Я пагаварыла са студэнтамі, што яны прэзентуюць перад іншаземцам сваю краіну, што веданне мовы (тут нават справа не ў тым, родная яна ці не родная, матчына ці не матчына) краіны, у якой жывеш, абавязковае. Я ім сказала: не ведаць беларускай мовы — гэта непатрыятычна. Гэта іх амаль шакавала: маладыя людзі не атаясамлівалі веданне мовы і патрыятызм.

Вольга Зелянко: Вы прывялі прыклад таго, як павінен сябе паводзіць разумны, кампетэнтны настаўнік.

Вячаслаў Даніловіч: Гэта сітуацыя зноў нас адсылае да сістэмы адукацыі. Гэтых студэнтаў у свой час не навучылі ў школе правільна адносіцца да сваёй дзяржавы, да сваёй мовы. Штосьці ім не дадалі ў сям'і, але школа павінна была выправіць такое стаўленне. Сістэма адукацыі павінна быць накіравана на тое, каб выхоўваць патрыётаў. Рабіць гэта як належнае — нармальна, спакойна, канструктыўна.

Вераніка Курцова: І тут павінна быць пераемнасць. З дзіцячага садка — у школу, са школы — у ВНУ.

Вольга Зелянко: Што да пераемнасці вучэбна-метадычнага забеспячэння моўнай адукацыі, то яна ў нас рэалізавана на розных узроўнях і ступенях навучання — у адукацыйных стандартах, вучэбных праграмах, падручніках. Але калі гэтыя праграмы і падручнікі ў руках абыякавага настаўніка, непрафесіянала, то ні пераемнасці, ні перспектыўнасці, на жаль, не будзе.

Вераніка Курцова: Камунікатыўнае асяроддзе павінна быць не толькі ў школе, яно павінна быць агульным. Колькі ў нас на тэлебачанні праграм па-беларуску? А колькі ў крамах беларускамоўнага візуалу? Гэта вельмі важны фактар распаўсюджання мовы ў нашым жыцці. І той жа самы сайт, на якім будзе аднолькава графічна напісана і па-руску, і па-беларуску, будзе ўплываць на гэта камунікатыўнае асяроддзе не менш, чым добры настаўнік у школе.

Алена Лапцёнак: Гэта камунікатыўнае асяроддзе ў тым ліку павінны пашыраць і мы самі, не чакаючы, што хтосьці зробіць гэта за нас. Як прыклад. У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі нядаўна было чытанне і абмеркаванне спектакляў. На беларускай мове. І першая фраза многіх удзельнікаў абмеркавання: «Прабачце, я дрэнна гавару па-беларуску...» Але далей людзі працягвалі казаць па-беларуску, бо на гэта іх натхняла камунікатыўнае асяроддзе, створанае ў пэўным месцы ў пэўны час.

Ігар Капылоў: У Акадэміі кіравання я працую з дарослымі людзьмі, слухачамі, якія праходзяць перападрыхтоўку. Паводле маніторынгу, які дзеля ўдасканалення навучальнага працэсу ў акадэміі праводзіцца даволі часта, ні разу слухачы не адзначылі, што мой моўны курс «Прафесійная лексіка ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму» не патрэбен, наадварот, адзначаюць, што мала гадзін. І гэта, заўважу, не філолагі, гэта людзі, якія працуюць у абсалютна розных сферах. Падчас нашых заняткаў яны пераходзяць на беларускую мову і даволі свабодна на ёй камунікуюць. Запыт на выкарыстанне мовы ёсць, і ён не змяншаецца.

Вольга Зелянко: Маўленчае асяроддзе ствараем мы самі. Пакуль сам чалавек не вырашыць карыстацца беларускай мовай у штодзённых зносінах, ніхто яму не скажа: «Шчыра запрашаем у наша маўленчае асяроддзе...»

Вячаслаў Даніловіч: Дзяржавай зроблена ўсё неабходнае, каб забяспечыць роўны статус беларускай і рускай моў, а пашырэнне сфер ужывання беларускай мовы залежыць ад нас з вамі, ад грамадзян Рэспублікі Беларусь, калі мы зацікаўлены ў развіцці беларускай нацыі і беларускай дзяржаўнасці.

Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НЕВЯСЁЛЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ СУСЕДЗЯЎ

Палякі масава здымаюць наяўныя грошы і асцерагаюцца хвалі звальненняў

Што ўжо граху таіць, не ўсё так гладка ў польскім каралеўстве, як хацелася б іх кіраўнікам. Не-не, ды і здараюцца неспадзяванкі ў выглядзе масавых звальненняў на буйных аб'ектах, на чым палітычныя апаненты дзейнай улады спрабуюць разжыцца лішнімі перавагамі ў гонцы за прэзідэнцкае крэсла...

Ад гэтага ўсяго ў насельніцтва краіны-суседкі аптымізму не дадаецца. З-за чаго людзі, баючыся яшчэ большага пагаршэння эканамічнай сітуацыі, перастаюць давяраць фінансавай сістэме і лічаць за лепшае трымаць зберажэнні пад падушкай.

Пачыталі польскую прэсу і ледзь не праслязіліся...

НЯМА КАНТРАКТА — НЯМА ЛЮДЗЕЙ

Так і хочацца сказаць польскім суседзям-абывацелям: прыязджайце ў Беларусь, тут ужо, сапраўды, з такімі праблемамі сутыкацца не давядзецца.

Пачытаем, чым жывуць суседзі. «Газета Паморска» даведалася, што вайсковы авіяцыйны завод № 2 у Быдгашчы — кампанія, якая мае стратэгічнае значэнне для Польшчы, кожны месяц развіваецца не менш чым з 20 супрацоўнікамі.

Завод у Быдгашчы ўваходзіць у Польскую зброевую групу. Кампанія заснавана ў 1945 годзе і, паводле яе сайта, з'яўляецца «адной з найбуйнейшых авіякампаній Польшчы, адной з элітных груп кампаній, якія маюць стратэгічнае значэнне для эканомікі і абароны Польшчы».

Як паведамляла «Газета Паморска» ў верасні 2024 года, заводам было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве з Boeing, але нешта, відавочна, пайшло не так... Вядома, што на прадпрыемстве працуюць 820 чалавек.

«Кожны дзень усе перажываюць аб працы. Ёсць вялікія непаразуменні на больш высокіх узроўнях», — распавёў газеце адзін з супрацоўнікаў. Апавяшчэнне павінны былі атрымаць некалькі дзясяткаў чалавек. Некаторым «лішнім» людзям не хапае некалькіх гадоў для выхаду на пенсію, таму знайсці новую працу ім будзе вельмі складана.

Адной з прычын скарачэння персаналу польскія СМІ называюць складанае фінансавае становішча прадпрыемства, выкліканае адсутнасцю новых кантрактаў. Адзначаецца, што да нядаўняга часу кампанія дынамічна развівалася, наймаючы новых спецыялістаў. Аднак сёння дзеючыя кантракты на абслугоўванне самалётаў заканчваюцца, а аб новых замовах «мала што вядома».

«Газета Паморска» папрасіла каментарый у авіязавода, але кампанія, паабяцаўшы, што адправіць яго, да моманту публікацыі яго не дала.

Прафсаюзная арганізацыя паведаміла, што кампанія скасавала калектыўны дагавор. «Гэта азначае, што замест выхадных дапамог, прадугледжаных Працоўным кодэксам, нічога выплачана не будзе. Гэта не добра, гэта вельмі дрэнна. Там напружаная атмасфера», — растлумачылі прафсаюзныя дзеячы.

ПІЯР НА ТЭМЕ ЗВАЛЬНЕННЯЎ

Сітуацыю з авіязаводам можна было назваць прыватным выпадкам, калі б не тэндэнцыя, якая пачынае выяўляцца і ў іншых галінах. Толькі за год колькасць паштальёнаў знізілася амаль на 2 тысячы чалавек. І гэта не мяжа. У рамках праграмы добраахвотных (і, натуральна, неаплатных) адпачынкаў польскі паштамт мае намер пакінуць без працы каля 9,3 тысячы чалавек.

